КНІГАРНЯ ПІСЬМЕННІКА

Алесь Дуброўскі-Сарочанкаў

# Эстэтыка маўчання

*Вершы, паэма*

Мінск, «Кнігазбор», 2011

УДК 821.161.3-1
ББК 64(4 Беи)-5
Д79

*Бібліятэка Саюза беларускіх пісьменнікаў
«Кнігарня пісьменніка». Выпуск 14.
Заснаваная ў 2009 годзе.*

**ISBN 978-985-7007-02-8**
© Дуброўскі А., 2011
© ГА «Саюз беларускіх пісьменнікаў», 2011
© Афармленне. ПУП «Кнігазбор», 2011

# ПРЫРОДА ЦІШЫНІ

* * *

Знікай, мая туга,
у раўнавазе змроку
і велічы.
Хавай свой позірк ад мяне.
Я разбіваю дзень
аб мокрую падлогу,
як вазу ў стылі «кітч»,
каб добры густ квітнеў.

Я буду развіваць
культуру сузірання:
вось дрэва пад акном,
вось горада агні...
У манаграфіі «Эстэтыка маўчання»
я напішу раздзел
«Прырода цішыні».

* * *

Ты варушыш паглядам вершаванае смецце,
пазяхаючы рыфмам услед:
«Што сказаць можа ў гэтым пракураным свеце
старамодны і смешны паэт?»

На вышынях якіх тое Слова ён знойдзе,
з гор якіх сюды прынясе,
дзе спацелае, згвалчанае стагоддзе
лахманамі слоўцаў трасе?

Слова ёсць і кагосьці аглушыць дазвання...
І, як рытар, узнімаю руку:
«Асуджальна-прарочае слова маўчання
хай гучыць у маім радку!»

# Два варыянты

Я буду спяваць.
Я спевам напоўню пакой.
Хай свечка гарыць
і хай паліць бяздушную цемру.
Мой дзіўны настрой,
удвух застанемся з табой,
і знікне разбэшчаных будняў
аблудная хеўра.
. . . . . . . . . . . . . . .
Я буду маўчаць.
Я маўчаннем напоўню сусвет
Хай зоркі гараць
і хай паляць знямогу прасторы.
Зіма — мой партрэт,
я былы выкшталцоны паэт.
Жыццё ёсць тэатр,
ды шкада — недавучкі акцёры.

# У прадчуванні восені

## Трыпціх

1

Гэта не сум.
Гэта проста канчаецца лета.
Жнівень сядзіць на валізах, і вось ужо
пляц прывакзальны вачыма гора-эстэта
верасень зноў аглядае — стары піжон.

Гэта не вецер.
Гэта ўздыхнула акацыя,
з шафы дастаўшы восеньскі свой гарнітур:
— Так калі пойдзе, дык трэба ў рыззё апранацца
і галасіць: «Масье, жэ не манж па сіс жур!»*

2

Лісцяў асенніх шалёныя зграі,
слёзы дажджу на акне.
Я гэты горад ізноў пакідаю,
ці ён пакідае мяне?..

Кіньце стагнаць, мая любая панна,
гэта яшчэ не канец.
Дома чакае гарачая ванна,
на небе — нятленны вянец.

Кіньце стагнаць: не разгорнуты кнігі,
трубы яшчэ не гучаць!

* «Спадар, я не еў шэсць дзён» (І. Ільф, Я. Пятроў «Дванаццаць крэслаў»).

Проста далёка яшчэ да адлігі,
проста — трэба паспаць.

3

Я расцякуся лужынай пяшчоты,
я віп'ю келіх змроку і дажджу...
. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .
Я развучыўся ўжо спяваць па нотах,
таму лібрэта проста раскажу:

у першым акце — ветру завыванне
і бас пяе пра люты свой намер,
далей усё як у старым рамане,
абы ад слёз зайшоўся ўвесь партэр...

І вось фінал: на сцэне — падазрона,
і прыкладна ў стагоддзя на рагу
старая небарака-прымадонна
пацее і пяе сваю тугу.

# Адкрыццё адзіноты

*Віталю Пятроўскаму*

1

Зрываецца дзень у прадонне прычын,
паводле якіх ты павінен аддацца
ў палон мітусні гэтых вуліц і пляцаў.
Натоўп адзінокіх — ён дрэнны дарадца.
Цябе не пачуюць — крычы не крычы.

Цябе не пачуюць: усюды сцяна
з камення вачэй і з цэменту шматслоўя.
І горада слепа-тупое надброўе
хавае нячэсаны смог-сівізна...

2

Вокны адводзяць пагляд:
ім не хочацца бачыць брыдоты
збэшчанай светам душы.
Гэта не фарс і не драма.
Сапрана мадам Адзіноты
тонка пяе «Настальжы...»

Прыйдзеш. Завесіш фіранкі.
І змора няўзнак адгукнецца:
«Толькі б заснуць хутчэй».
Можна, урэшце, і так...
Толькі хочацца часам пагрэцца
ў цемры чыіхсьці вачэй.

## 3

Твой позірк часамі бывае ўтрапёным:
такім бы на неба глядзець — самы раз.
Давай паглядзім. Вось абрыс Арыёна —
так проста і з густам: дызайн экстра клас.

Давай памаўчым. Гэта добрая справа —
на словы забыцца. Маўчанне ёсць рай.
Па свеце і так філалогіі слава
грыміць, як стары гумілёўскі трамвай.

Давай памаўчым, бо ад слоў ванітую:
мсье Сартр узяў трывіяльны сюжэт.
Давай памаўчым і нарэшце пачуем,
што хоча ўвесь час зашаптаць нам сусвет.

І думак вар'яцкія спыняцца скокі,
і голас якісь прагучыць уначы:
«Я Бог. Я таксама крыху адзінокі.
Хадзі сюды, дружа. Давай памаўчым».

* * *

Хвіліны ёсць, калі маўчаць нябёсы,
самота ліжа сэрца берагі.
Ты нёс піялу слёз, і неданёс, і...
І на падлозе — лужына тугі.

Ты просіш голасам напоўніць твае вушы,
ды стуленыя вусны цішыні,
і вочы неба снежань зацярушыць,
пустэча зацярушыць твае дні.

І без натхнення памірае вечар,
і б’ецца ноч у вокнаў берагі...
Ты нёс бакал самоты чалавечай...

І на падлозе лужына тугі.

* * *

Я не ведаю, як разумець гэты свет,
я не ведаю, як мне вяртацца адгэтуль
да Цябе, да Таго, хто аддаў мне планету —
найтаемнейшую сярод іншых планет.

Я не ведаю, як мне змываць гэты бруд,
гэты чорны куродым спатнелых стагоддзяў.
Сярод гэтай зімы я зусім не па модзе
апрануўся ў старых абгавораў сурдут.

Бо ў маім гардэробе — ганебнае тло,
а ў гасцёўні маёй пагнілі і шпалеры.
«І па водах ступіць не хапае ўжо веры».*
Значыць, трэба мяняць неадкладна жытло.

Значыць, трэба спыніць гэты моташны сон,
трэба вырвацца з гэтых ліпучых абдымкаў.
Спадзяюся, не знойдзе ніхто чорнай скрынкі,
толькі скажа той слуп на рагу: «And so on»**.

---

* І. Бродскі «Літоўскі дывертысмент».
** І гэтак далей (*англ.*).

* * *

І адкуль такое адчуванне,
быццам не жывеш, а, як бы ў сне,
згадваеш банальныя прызнанні,
што даўно ўжо зроблены не мне.

Так далёка, так далёка восень,
толькі нешта плача зорны мак,
і знікае вечар і галосіць
па маім нявымаўленым «так».

Не чакаў, што прыйдзецца нарэшце
перапісваць, як шпаргалку, лёс
ды ісці па выхаджанай сцежцы,
што калісьці ўзносіў да нябёс.

Ды аднекуль цягнецца жаданне
паглядзець праз жалюзі ў акне,
як сусвет узніме скавытанне
ад майго разбэшчанага «Не!»

* * *

Распусціў свае цені горад
у атраманце поўначы.
Сёння трэба ў мігценні зорак
свету пульс табе зноў лічыць.

Як руку — на запясце, позірк
пакладзеш ты на Млечны Шлях.
І чакаць ён будзе ў трывозе,
і спытае: «Доктар, ну як?..»

* * *

Дайце мне паверыць безаглядна
ў велічнасць асенняга дажджу.
Надта ўжо рашуча-лістападна
год праводзіць мокрую мяжу.
Надта ўжо спяшаецца стагоддзе
кінуцца на рэйкі небыцця...
Хто адкажа ў дзікім карагодзе,
што раблю ў сусвеце гэтым я?

* * *

Гэты горад павіс нада мною, як меч.
Гэты час усмактаў мае ўсмешкі і думкі.
Толькі здзеклівa мрояў даўнейшых карункі
мне ў пакоі нагадвае кожная рэч.

І струменіцца Свіслаччу ціхай жыццё,
у бетонным ручве нема душыцца астмай.
Ды наступных турбот непамытыя пасмы
раскудлаціць тралейбусаў злое выццё.

Цішынёй сагрэты час
аддае даніну стоме.
Мы чужыя ў гэтым доме,
гэты вечар не для нас.

Гэты вечар для святла,
што ліецца з бруднай лямпы.
Дзён старыя фаліянты
будзем мы паліць датла.

Цешыць гутаркаю вас
я, папраўдзе, не ахвочы.
Плача на акне альяс...
Гэты вечар не для нас,
пачакаем, мабыць, ночы.

* * *

Змяркаецца.
Чорнае лісце
глядзіцца ў затокі крышталь.
Для некага сёння выйсце —
танюткая вострая сталь.

Сусвет складае далоні
ў малітве вячэрніх гадзін
за тых, каму холадна сёння,
за тых, хто сёння адзін.

# Страшна

Сусвет працінае паглядам: пустыя вачніцы
глядзяць праз цябе, і маўчанне ляціць наўздагон.
У гэтым натоўпе, што спіць і прачнуцца баіцца,
так страшна ўявіць хоць на момант,
што гэта не сон.

Так страшна заўсёды і гэтак штораз непрывычна
вачыма лавіць асенняга неба пагляд.
І золата колькі б не кідаў пад ногі кастрычнік,
ілюзій няма — за ім прыпаўзе лістапад.

І ў гэтым натоўпе, дзе кожнаму страшна
прачнуцца,
таемная думка ўвесь час неадчэпна дзяўбе:
схавацца б дзе-небудзь, у нейкім куточку
прыткнуцца,
каб гэты халодны сусвет
не заўважыў цябе.

* * *

Мы ідзём па-над хвалямі
величнай часавай плыні,
па шляху, на якім нам з табой
не пакінуць слядоў.
Гэты свет быў заўжды
толькі чэравам чорнае скрыні —
у забытых руінах
нялічаных Богам гадоў.
. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .
Зірні пад ногі.
Ты калі-небудзь думаў пра тое,
што наш шлях —
гэта сцежка, перарэзаная
спарахнелымі каранямі
дрэва пазнання дабра і зла?
. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .
Мы ідзём па лязе існавання,
мы шукаем мінулыя дні.
Пад нагамі — дрэва пазнання
спарахнелыя карані.

Але ў свеце гэтым, вядома,
мы да часу, толькі ў гасцях.
І шуміць ля нашага дома
светлым лісцем дрэва жыцця.

Не адчуўшы дажджу на далоні,
з ганка ў жнівень сыду.
Чыйсьці воклік мяне дагоніць:
— Прыпыні хаду!

І здагадка марудзіць не стане
(не сямнаццаты хлопцу год) —
гэта жніўня *майго* дыханне,
гэта голас яго.

Хутка лягуць люстэркі лужын
вераснёўскіх наўсцяж.
Можна так прайсці, не адчуўшы
пад нагамі жыцця.

* * *

Калі распранаецца свет прад тваімі вачыма,
ты мусіш глядзець, ты не можаш пагляду
схаваць.
Ты бачыш усё — нават сорам той аблачыны,
якая, магчыма, яшчэ не ўмее кахаць.

Ты мусіш глядзець, калі раптам ілюзіі ветрам
зрывае з галля рэчаіснасці.
Мусіш глядзець...
І гэтак шчымліва гучыць ідылічнае рэтра
на шумным праспекце
з няшумнаю назваю —
Смерць.

# Пытальнік на палях

Ты калісьці любіў гучанне
таямнічых, прывабных слоў,
пекных рыфмаў цьмяныя здані
чуў у шэпце начных галасоў.
І мелодыі дактыляў, ямбаў
як гіпноз для цябе былі,
і ты йшоў, быццам той самнамбул,
куды гукі цябе вялі...

Ці тады, дружа, быў ты вар’ятам,
ці ты зараз — няшчасны жабрак?..
Што плявузгалі нам, кацянятам, —
аказалася ўсё не так.
Насамрэч мы жывём з табою
ў час з кароткай назваю «post-».
Тут не класікаў, не герояў —
апакаліпсісу фарпост.

І эпоха наша свой нораў
праяўляе ў кашмары сноў,
дзе сусвет — гэта поўны збор твораў,
дзе жыццё — пыл з абрэзаў тамоў.
Так скрыжалі стагоддзяў лоўка
параспісвала войска пісак,
што ўжо нават пытальнік алоўкам
на палях не паставіш ніяк.

* * *

Тут горад ліецца ракою бязглуздзіцы,
там неба ліецца знічак дажджом.
Ты ўжо захлынуўся на вусцішных вуліцах.
Не тут і не там твой дом.

Ты надта лагодны для свету драпежнікаў,
ты надта пачварны для свету святых.
Кастрычнік на голле самоту развешвае.
Самотніцкі неба ўздых.

Ты можаш пачаць спектакль ці істэрыку,
ці проста аддацца сну,
ці проста адкрыць яшчэ раз Амерыку.
Ці зорку — яшчэ адну.

* * *

Зноў сакавік да лютага лашчыцца —
досыць скандальны сюжэт.
Хто там таўчэцца з разяўленай пашчаю?
Прагны да бруду свет.

Хтосьці ў кішэні каменне рассоўвае,
хтосьці ад злосці зароў.
Ноч кракадзілавы слёзы насоўкаю
сцёрла з шыбаў дамоў.

Што ты шукаеш, як той звар’яцелы,
ў гэтым натоўпе яшчэ?
Кінь! Гэта статка галоднага цела,
россып пустых вачэй.

* * *

Гэта ты, мая ноч, мая смешная дзеўка,
цягнеш спеў пра вясну, маладосць і любоў?
Ці паверыць мне гэтым бязглуздым прыпеўкам,
што цалуюць пшаніцу маіх валасоў?

Мо паверу і плюну на шэпты сумненняў,
што смяюцца з мяне ў калідорах глухіх...
Не прачуе ніхто: пад блюзнерскім адзеннем
сваё сэрца схаваў абыякавы «мніх».

# Экзальтацыя

Над вачыма маімі халоднае сіняе мора
ціха плёскае ў зорных абдымках сусветнай маны.
Перад позіркам гэтай спрадвечнай хлуслівай
прасторы
растрасуць шалупінне мае мітуслівыя сны.

Хутка пройдзе зіма: дзесяць тыдняў — і сонца
ўваскрэсне.
І ўзляціць над зямлёю мой шэпт — сябар мой
сакавік.
Гэта зноўку пачнецца: далёкаю цёплаю песняй
прыйдзе подых адзіных маіх незабыўных адліг.

Гэта песня ўварвецца ў заспаныя брудныя вокны
і пагасіць маркотныя свечак зімовых агні,
і ў душы маёй сціхнуць вятроў дэпрэсіўныя
стогны,
і пакажуць мне спіну мае мітуслівыя сны.

# Паклонніку мастацтва

— Что ты видишь во взоре моём,
В этом бледно-мерцающем взоре? —
Я в нём вижу глубокое море
С потонувшим большим кораблём.

*М. Гумілёў*

Гэта ты, гэта зноўку ты.
Ты прыходзіш сюды ў спадзяванні,
што рэальнасць пужлівай зданню
знікне ў хвалях чужой мілаты.

Ды чужая яна — як лёд,
і далёкая — як учора,
і ў паглядзе яе не «мора»,
а тваё надта смешнае гора
і *халодных* крылаў узлёт.

* * *

Радкі вялікія ўзнікаюць толькі ноччу.
І тая ноч ёсць ноч душы маёй,
калі ні сну, ні думак — толькі крочыць
змрок сцежкай кругавой.

І гэты змрок — бяссільны крык адчаю.
І вочы — камяні.
Люстэрка адбівае цемры зграю.
Я не крычу, не плачу. Я — знікаю.
Знікаю ў цішыні.

* * *

Я хачу прабіцца да сэнсу
праз таўшчэзную слоў браню.
Мураванай сцяны акенца,
калі-небудзь цябе прысню.

Падыду, з трымценнем у сэрцы
лбом прыцісну халоднае шкло
і пабачу — з цяжкасцю верыцца —
залатое нябёсаў святло.

Прамянёў ядвабных суквецце,
ты сагрэй мяне, ахіні...
Толькі сняцца мне ў гэтым свеце
безнадзейна зямныя сны.

# Вяртанне да паэзіі

Вяртацца смешна да таго,
што кінуў «раз і назаўсёды»,
ды графаманства без нагоды
выплюхваецца з берагоў.

Я зноў шукаю адкрыццяў
ў шаманскім заклінанні рыфмаў,
і плынь культуратворчых прымхаў
зноў мае атрымаць працяг.

Я зноў у пошуках таго
адзінага са слоў сусвету —
як быццам ёсць яшчэ ў паэта
надзея адшукаць яго...

# «Так было не аднойчы...»

1

Я толькі прадчуваю гэта:
самотны бліск вачэй тваіх,
калі ў бязмежнасці сусвету
я напаткаю бездань іх.

Я гэта толькі прадчуваю:
твой голас ціхі, трапяткі,
калі ў бязмежнасці адчаю
крануся цёплае рукі.

Мне невядома, дзе ты, хто ты,
мне незнаёмы позірк твой,
але ў прадонні адзіноты
я прадчуваю *нас з табой*.

2

Знайдзі мяне — у шамаценні дрэў,
пачуй мяне — калі ўздыхае восень.
Не бойся падысці, бо на двару
няма нікога; поглядаў не бойся,
калючых поглядаў, нібы асцё.
Не бойся падысці і проста ў вочы
мне паглядзець: я зразумею ўсё...

3

Гульня аднойчы робіцца пакутай,
і пачуццё за жартам не схаваць,
а ты дзіцё, а я асёл надзьмуты,
і час над «і» ўжо кропкі расстаўляць.

Ёсць пэўны від жахлівага вар'яцтва,
калі ты бачыш: вось, паехаў дах,
ды моцы ўжо няма спыняцца,
і марыш, як падлетак, па начах.

4

Ты згадаеш: калі рассыпаліся далі
на аскепкі — пад гэтым сусветным дажджом
мы з табою стаялі ўдваіх і чакалі,
што нам ноч прынясе сваім мяккім крылом.

А яна нам прынесла лістоту на сцежцы
і нягучныя крокі асенняга сну,
і ў тваёй прадчувальна-няпэўнай усмешцы
ўбачыў я на імгненне трапяткую вясну.

5

Ты хочаш тут быць?
Адкажы мне: ты хочаш тут быць?
Ты хочаш застацца са мною?
Ты хочаш чуць словы мае?
І бачыць мой позірк?
І да рукі маёй дакрануцца?
А можа, да вуснаў?
Ніхто да цябе не рабіў так.

І я не дазволю табе
зрабіць так, а потым забыцца
на гэты ўчынак.
І ведай, што, робячы так,
ты робіш надзвычай сур'ёзную справу.
І можаш занудам назваць мяне —
я не пакрыўджуся.
Я больш ні на што не пакрыўджуся.

6

Давай пяройдзем спакваля на «ты»:
хачу забыць, што мы чужыя людзі.
Апошні лёд, што нам пакінуў студзень,
растопім у абдымках цемнаты.
І будзе шэптам месяц залаты
з зямлёю размаўляць аб вечным цудзе,
і перашкодай нам дваім не будзе
самота сакавіцкае слаты.

І мы ўзляцім над часам і прасторай,
за спінаю пакінем наша ўчора.
Далёка ўнізе — сумная зямля
пад брудным футрам леташняга лісця...
Давай з табой забудзем спакваля,
што незнаёмымі былі калісьці.

7

Ёсць нешта большае за сон,
калі ўсыпляе цела стома, —
пачуць твой шэпт, адчуць твой стогн
і ў вырай адляцець самому.

Экстаз? Што можа быць прасцей?
Тваё імя сказаць раз соты.
І — можа, я і звар'яцеў —
ёсць нешта большае за дотык,

за ласку... Што гэта? Маўчу:
ці ж зразумець вякоў асновы?
Калі твой погляд уваччу,
ёсць нешта большае за словы.

8

А ты згадай, як была зіма,
згадай, як снег казытаў вітрыны
і вечар зрабіў адзін узмах,
узмах рукою, — зоркі раскінуў...
І паляцелі мы туды,
куды ніхто не трапляў ніколі,
і нехта строгі нам не дазволіў
здымаць на камеру гарады,
якія, аказваецца, ёсць на небе.
Мы бачылі сонца колеру сноў.
Нейкі, з пейсамі, змрочны рэбе
сказаў, што вельмі глыбокае дно
ў моры колеру золата, і таму
мы вырашылі там не купацца:
навошта прымушаць хвалявацца
шаноўнага рэбе?

## 9

І ты будзеш зноў са мной.
І свет перальецца ў вечнасць.
А восень падасца нечай
усмешкай... знаёмай такой...
А вечар падасца катом —
галодным катом прамоклым —
і будзе скрэбціся ў вокны
ліхтарным цьмяным святлом.
А ты будзеш зноў са мной.

А потым цябе не будзе.
І будуць чужыя людзі...
І студзень, жахлівы студзень,
з хлуслівай сваёй цішынёй...

## 10

Прымі скамечаных радкоў
маю знявечаную споведзь
і, калі вечар будзе мроіць
сярод зняверaных дамоў
пра лепшы лёс, — спалі лісты,
забудзь мой голас, выкінь здымак,
праедзь з усмешкай мой прыпынак.
Забудзь, што мы былі на «ты».

## 11

Паверхня сну люляе цішыню.
Паціху золак выйшаў на падмосткі.
Я быў калісьці тут і сёння сню —
наяве сню мінулага пялёсткі.

Мінулага міраж — мой вечны сон,
мой вечны стогн — былых пачуццяў подых.
Было мне добра тут, і згадак плён —
мой дзённы сон і цёплых мар чароды.

Мне марыцца: ты вернешся наноў,
ты прыйдзеш да мяне, маё натхненне,
мы будзем зноў над шумам гарадоў
лунаць і піць мелодый слоўных цені;

мы стрэнемся з табой (о дэжавю!),
мая вясна, насмешніца-каханка.
Паверхня сну люляе цішыню...
Я быў тут, і мы стрэнемся да ранку.

Мы стрэнемся з табой, мая любоў,
о першая любоў... А ці была ты?
Усё прайшло. Мой вечны енк, мой стогн,
я вылечыў цябе — ідзі за краты!

## 12

*З Мікалая Гумілёва*

Так было не аднойчы і будзе заўжды
Ў барацьбе нашай, злой, апантанай:
Як заўсёды, мяне адцуралася ты,
Заўтра ж вернешся зноў пакаяннай.

Толькі, люты мой друг, папярэдзіць дазволь:
Не здзіўляйся ў сваім пакаянні,
Калі раптам зліюцца пяшчота і боль,
Калі кроў афарбуе каханне.

# ПАРОДЫ БЕЗ АРЫГІНАЛАЎ

* * *

Назапасіў снежань бясснежны
дзён імклівых драбнюткі шрот...
Вось і першая восень без вершаў
мой пакінула карагод.

Ну й няхай, невялікая страта:
гэта мала каго кране.
Балазе на зямлі багата
графаманаў і без мяне.

Рану гэтую літаратура
мо загоіць нейк спакваля,
як зімовая хутка віхура —
галізну гарадскога галля.

Я не Байран, я крышку іншы,
як казаў расейскі паэт...
І не звяне без маіх вершаў
аніводны мо *першацвет*.

І таму непатрэбна плакаць,
можа, нават наадварот.
Проста я ўжо старэю, мабыць,
бо мне дваццаць будзе праз год.

* * *

Сярод зорных крывадушных шэптаў
крочу я.
Сёння ў ліку я тваіх адэптаў,
ноч мая.

Да цябе калісь я бегаў пажам
ад зямлі.
Сёння мы з табой на троне разам
каралі.

Ты адкрыла мне ўсе таямніцы,
куфры ўсе.
Бачу: твае футры і спадніцы
моль грызе.

«Все мы, все мы в этом мире тленны» —
се ля ві.
І няма прычынаў грызці вены
да крыві.

І табе, маёй нявернай музе, —
рэзюмэ:
мяне плач старых маіх ілюзій
не кране.

Мы ў дзвюх краінах — я і ты.
У двух сусветах.
Між намі — мора глухаты,
не чую — дзе ты.

Мы ў двух сусветах. Пані Ноч
лягла між намі.
Прастора п’е галактык скоч,
як у рэкламе.

Стаяць маўкліва гарады,
смяецца ветах,
крычаць паэты цемнаты:
«Liberum veto!»

І ліпкіх слоў прадажны трэст
ніяк не змоўкне.
Ars longa, vita brevis est, —
пустыя стогны.

Ёсць толькі ты, ёсць толькі я...
І ўсмешак скокі.
Ды паміж намі — дзён змяя.
Я адзінокі.

Між намі вечнай мілаты
ляжыць вендэта.
Мы ў дзвюх краінах — я і ты,
у двух сусветах.

* * *

Твая фатыга зменіцца тугой,
тугу распусціць роспач, распачатая
тады, калі нябачнаю рукой
твой чорны лёс паслаў цябе за краты
твайго бесперспектыўнага жыцця.
Тады твой запалоханы пакой
залье чырвоны подых небыцця...

# Трыпціх

1

сталёвыя вусны
пяшчотных аблокаў
цалуюць узлётныя паласы
аэрадромаў
якія даўно набрынялі
слязьмі пагаднення
хай здзейсніцца час!
хай адбудзецца веліч!
і мы ўжо ніколі
ніколі з табой не расстанемся

2

я люблю твой ціхі шэпт
мой жоўты трактар
ты прыходзіш да мяне
калі я змываю
пад душам цішыні
сваё натхненне
ты мяне абдымаеш
сваёй узрушанасцю
і я належу толькі табе
і ты належыш прасторы

## 3

сёння вечар
заўтра будзе ноч
паслязаўтра раніца
калісьці мы сустрэліся
але ты не хочаш
памятаць пра гэта
ты пакідаеш у палоне восені
мяне
мае лісты
таму ніхто не спаліць іх

# Псеўдахоку

1

я куплю старажытную амфару
і разаб’ю яе
аб падлогу прыбіральні

2

я раскапаю горад
стану пасярэдзіне
і буду ванітаваць

* * *

Эх, якое шчасце гэта —
пальцам калупацца ў носе
і глядзець у твар сусвету
з ціхай думкаю аб лёсе,

і ўначы, нібы ў пустэльні,
гатаваць сабе яечню
і ўзірацца на патэльню
з ціхай думкаю пра вечнасць.

# Усё напісана да нас

1

я ўмею добра ставіць дату
пад пэўнай колькасцю радкоў
я ўмею файна распісацца
на белай аркуша пустэльні
а што яшчэ патрэбна мне?

2

усё напісана да нас
таму адкрыць патрэбна газ
запалкаю стварыць пажар
арэвуар арэвуар

# Гефсіманскае галлё

Госпад, Бог твой, ёсць агонь,
які паядае.
*З Біблії*

Мы жылі ў гэтым свеце, не верачы
ані ў бездань, ані ў вышыню...
Знікла ўсё. Я стаю перад веліччу
і жыццё сваё сню.

Знікла ўсё, і крыштальнымі кроплямі
час дрыжыць на струне небыцця.
Пан Агонь сівым прысакам-попелам
перасыпаў прасцяг,

бо ў сусвеце з яго «непахіснасцю»
падуладна ўсё Пану Агню...
Знікла ўсё. Я стаю перад існасцю
і *бясконцае* сню.

Benedictus qui venit in nomine Domini*...
Блаславёны, хто кінуў прывычную ролю.
Расцякаецца ноч легкаважнымі промнямі,
што народжаны ціхай тугой жырандоляў.

Мы праменне. Наш шлях анікім не акрэслены.
Лёс наш — цемру ўлагоджваць, бы жонку ліхую.
. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .
Божа, будзь маёй зоркаю, будзь маім крэсівам:
benedictus qui venit in nomine Tui**.

* Блаславёны, хто ідзе ў імя Госпада (*лац.*).
** Блаславёны, хто ідзе ў імя Тваё (*лац.*).

Вазьмі мой голас, працягні руку мне,
святло ў акне мне запалі ярчэй.
Ты бачыш: сёння я чамусьці сумны;
хоць Ты са мной — я не з Табой яшчэ.

Я не з Табой, я ад Цябе далёка.
Ты — ля дзвярэй, я ж не знайду driveчэй.
Ды бачыш Ты праз мураванне змроку
агонь лампады — крык маіх вачэй.

* * *

Ты разгарні маю тугу,
як доўгі ліст з-за акіяна,
і сярод зорнага туману
параскідай, нібы лузгу.

Ты прачытай маё жыццё,
маю адвечную самоту
і на маё пытанне «Хто Ты?» —
адказ шапні, як адкрыццё.

Мой голас велічнай рукой
вазьмі і распусці ў сусвеце.
Няхай прысніцца ўночы дзецям
пяшчотных зорак малако.

Даруй, я не магу спыніць
сваю бязглуздую малітву:
так многа смешных і нязбытных
патрэбна мар Табе адкрыць.

Сустрэнь нястрога гэту плынь,
«славес» маіх прабач кашчавасць.
Ды сярод вечнасці глыбінь
маю гранічную цікавасць*
Ты без увагі не пакінь.

* Гранічная цікавасць — так тэолаг XX стагоддзя П. Ціліх называў веру.

* * *

Веру. І гэтая ноч
расціскае пяшчотныя пальцы.
Памяць плыве ў вышыню.
Я забываю свой сон пра жыццё.
Пачынаюцца танцы
дзіўных стварэнняў агню.

Што гэта? Чый гэта позірк?
Вар'яцтва — цудоўнае слова.
Здані да свечкі ляцяць.
Вусцішна тут. Я спрабую
прабрацца ў будову
ісціны.
Цяжка пісаць.

Цяжка пісаць і не ведаць,
ці знойдзецца нехта з вачыма
ў гэтым сусвеце сляпых.
Дайце душы маёй крыку
і больш не пытайце прычыны.
Што вам з прычын маіх?

Веру. І гэты давер
да спрадвечнага Госпада-Слова
цвік мой, і крыж мой, і трон.
Так, sola fide*, магчыма, спасцігну будову
багны й нябёсаў закон.

---

* Толькі верай (*лац.*).

* * *

Цесныя вароты і вузкі той шлях, што вядуць у жыццё...
*З Біблії*

Разальецца сонца ў небе полымем,
і забудзе мора берагі.
Каралямі, безнадзейна голымі,
разбягуцца ў сораме шляхі.
Ды ў хаосе велічы і роспачы,
асвятліўшы ўсіх вар'ятняў жах,
як прамень у непрагляднай поўначы
будзе ўсё ж той найвузейшы шлях.

Цень гефсіманскага галля
згушчаў самоту страшнай ночы,
і Ён маліўся: «Ава, Ойча,
хай будзе воля не Мая.

Хай будзе воля не Мая:
хай страшны келіх, што прарочыў
Мне выпіць лёс, — як Ты захочаш —
ці вып'ю, ці не вып'ю Я».

І Ён згадзіўся з Божай воляй...
Нам келіх той не выпіць болей,
ды гефсіманскае галлё

і зараз нас, бывае, страшыць,
і шэпчам мы: «Згінь, насланнё!
Хай воля здзейсніцца не наша».

* * *

Спыні мяне, о Госпадзе, спыні.
Аклікні. Праз вар'яцтва маіх будняў
руку мне працягні і ахіні:
мне холадна ў касмічнай гэтай студні.

Мне холадна, мне брыдка, гэты свет
вадою лужын мне запырскаў вочы.
Два словы ў сэрцы: «*Суета сует*».
Суцеш мне сэрца, любы Ава, Ойча!

Але скажу: ёсць зло за ўсё цяжэй,
цяжэй за свет, за бруд жыцця зямнога.
Прашу: ратуй — не, не ад рук людзей —
збаў мяне, Божа, ад мяне самога.

* * *

Дакрануцца хачу да Тваіх ледзь прыкметных
адбіткаў,
да слядоў Тваіх ног, што захоўвае пільна сусвет.
Мая песня — ручай без Цябе, нешырокі
і плыткі, —
цёмным лесам струменіцца між каранёў
неўпрыкмет.

А з Табой мая песня лес цёмны трасе ды хвалюе.
Злосна шэпчуцца дрэвы, не ўцяміўшы мову маю:
хочуць іншую песню, што слых далікатна мілуе,
ды не ўспомніць яе мне — мелодыю тую старую.
Лепей гэтую неяк ужо дапяю.

* * *

І надыдзе вялікае свята:
паміж хмар сусветнай тугі
пройдзе неба адвечны Араты —
пахіснуцца зямныя багі.

Пахіснуцца, і пашча пекла
іх пакліча ў вечны агонь,
і ў сусвеце зробіцца светла
ад вачэй Пана майго.

Пахіснуцца і знікнуць краты,
калі ў гэты змарнелы свет
прыйдзе сэрцаў вялікі Араты
і нябёс адвечны Паэт.

* * *

Саўл, Саўл, што ты гоніш
Мяне?
*З Біблii*

Мая дарога кволай ніткай тчэ
зямных стагоддзяў цень.
Маю дарогу хай перасячэ
Твой голас, як прамень.

Хачу адчуць, як голас вечны той
маю душу кране.
Пачую толькі я і больш ніхто:
«Што гоніш ты Мяне?»

Прамень упаў. Што за яго ярчэй?
Зніклі абрысы дня.
Ды ў цемры плоцевых маіх вачэй
відушчым стану я.

Мяне Ты знойдзеш на шляху маім
і скажаш мне: «Устань»...
Адвеку тчэцца ўзорысты кілім
Тваіх шляхоў. Што ў параўнанні з ім
зямных стагоддзяў здань?

* * *

Дзень прайшоў, яшчэ адзін з безлічы,
і спыніўся — ля Тваіх ног.
Ты мой Бог. Ува ўсёй Сваёй велічы
Ты *мой* Бог.

Ты — уздых мой — дзе цемрай надыхана,
дзе ні дыхаць, ні жыць — галасіць,
дзе агіднай прыроджанай пыхаю
набрыдзь шэрая брыдка смярдзіць.

Але як не зліцца з брыдотаю,
як не выпесціць пыху ў ёй?
У сутычцы паміж згрызотамі
адшукай сумленне маё.

У сутычцы паміж сусветамі
адсачы мой звілісты шлях.
Самы блізкі Ты й самы нязведаны —
Хто мой шэпт трымае ў руках,

Хто мой позірк вачыма бяздоннымі
пераносіць туды — за парог...
Над фальшывымі камертонамі,
над багамі, над незлічонымі, —
*Ты* мой Бог.

# Знікненне

А Ты сумел под рубищем укрыться,
И я не знаю, где Тебя искать.
*Антанас Ясмантас (Мацэйна)*

Як мне пачуць Цябе — Твой голас ціхі,
калі мой дух у сумятні засмаг
і розум, бы ў пакутах парадзіхі,
крычыць, адчуўшы ўвесь абсурду жах?

Як іншым разам мне пачуць таксама,
калі Свой суд Ты абвяшчаеш мне
і голас Твой знішчае сцены храмаў,
ды толькі маё сэрца не кране?

Урэшце, як пачуць Тваё маўчанне,
калі, імшу стварыўшы і пасты,
я бачу... мне здаецца... плачаш Ты
над пустатою гэтых намаганняў!

# Раство і Уваскрэсенне

1

Ноч вар'яцтва змяняе вар'яцкае ранне
і насустрач ідзе вар'яцкаму дню...
Толькі Слова можа перамагчы маўчанне.
А маўчанне ці зможа перамагчы хлусню?

Сына Божага нараджэнне ў краіне Ірада
азначае, што будзе на снег ліцца кроў.
Сніў прарок, як без твараў хлуслівыя вырадкі
віншаванні прымалі ад хлуслівых сваіх святароў.

Слова Божага ўваскрэсенне ў краіне Пілата
азначае, што сямігаловы звер,
які з мора выходзіць, ужо пракляты...
. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .
Толькі Бог можа перамагчы смерць.

## 2

Яго ўваскрэсенне — праз кроў
прынесці вестку пра збаўленне
ў краіну хцівых гандляроў,
што прадалі сваё сумленне.

У немачы людской Хрыстос
моц Бога праявіў і праўду
сярод хлусні, крыві і слёз
перад Пілатавай уладай —

там, дзе сямігаловы звер
ужо выходзіць з бруднай пены...
Хрыста ўваскрэсенне — праз смерць
жыцця прынесці адраджэнне!

Ціха шэпча вятрыска,
стук дажджу па акне...
Ты далёка ці блізка?
Ці Ты чуеш мяне?

Ты далёка ці блізка,
Божа мой, Божа мой?
Ты высока ці нізка?
Я хачу быць з Табой.

Я хачу з Табой зліцца,
растварыцца ў Табе.
Не жадаю згубіцца
ў марнай той барацьбе,

дзе гады паліць прага
дасягнення вышынь,
бо вышыні — сярмяга,
мітусні злая плынь.

Мне абрыдла імкнуцца,
мацаць шэрую столь.
Да Цябе дакрануцца,
святы Божа, дазволь.

Да мяне нахіліся
і дыханнем сагрэй...
Восень. Жоўтае лісце
на дварэ вядзе рэй.

Ціха шэпча вятрыска,
стук дажджу па акне.
Ты далёка ці блізка?
Ці Ты ёсць ува мне?

* * *

На паліцы — старых паперчын
цэлы стос.
Я даўно не пісаў Табе вершаў,
мой Хрыстос.

Я даўно не маліўся ў рыфму —
выбачай.
Сёння даўніх пасеваў — ліўма! —
ураджай.

Сёння буду псалмы спяваць я
да святла.
Пройдзе ноч, і заўважу наўрад ці,
што прайшла.

# З Псалтыра

Злітуйся, Божа, з ласкі вялікай Тваёй,
шчодрасцяў мноствам Тваіх знішчы грэх мой дазвання,
дай жа мне зноўку адчуць радасць выратавання.
Злітуйся, Божа, з ласкі вялікай Тваёй.

Вусны мае растулі — і ўсхвалю Цябе, Божа.
Праўду Тваю абвяшчу я ўсім людзям зямлі.
Будуць з Табою ўсе тыя, хто ў цемры жылі.
Вусны мае растулі — і ўсхвалю Цябе, Божа.

Чыстае сэрца ствары ўва мне, Госпад вякоў,
зноў узмацуй мяне словам Тваім уладарным.
Веру: Цябе заклікаю, мой Збаўца, не марна.
Чыстае сэрца ствары ўва мне, Госпад вякоў.

Ты не жадаеш ахвяр ці дароў незлічоных —
іншае будзе ахвярай Табе сапраўды.
Богу ахвярай каштоўнай — не скарб залаты,
Богу ахвярай заўжды толькі дух засмучоны,
сэрцам пакорным павек не пагрэбуеш Ты.

# З Эклезіяста

1

І мовіў Саламон: усё пустая марнасць.
Як плёну паспытаць ад працы сваіх рук?
Сыходзіць род людскі, зямля ж заўжды
ўладарыць,
малюе сонца свой бясконцы круг.

Ад поўначы да поўдня кружыць вецер.
нясуць даніну мору рэкі ўсе,
ды як напоўніць мора?.. Дзён суквецце
знікае ў смецці пакрысе.

І як напоўніць вока зрокам,
як вуха слуханнем заліць,
як не пакінуць шанц сурокам,
што тчэ стагоддзяў ніць?

2

Што рабілася, тое й будзе рабіцца,
што было калісь, тое вернецца зноў.
Нам не суджана ў гэтым свеце здзівіцца,
бо старое ўсё ад пачатку часоў.

Кола коціцца па старой каляіне,
і што дзеецца — дык не ў першы ўсё раз.
Няма памяці пра былыя часіны,
і ў нашчадкаў не будзе — пра нас.

## 3

І быў я пастырам. Ізраіль быў мой статак.
Я свет хацеў змясціць у розуму палон.
(Даў людзям Бог цяжкі гэты занятак —
практыкавацца ў ім да скону сваіх дзён.)

Я бачыў справы ўсе, што робяцца пад сонцам.
І вось усё — плён марнасці благі.
Не выпрастаў крывых, не падлічыў бясконцасць,
астатняе зрабіў, ды толькі сэнс які?

І кінуў мудрасць я — сумніўную навуку,
і вырашыў спазнаць вар'яцтва хараство.
Але і гэта — горкае пітво:
хто веды множыць — памнажае скруху...
Усюды марнасць і знямога духу.

## 4

Для кожнай рэчы ёсць свой час пад небам:
выходзіць з глебы і вяртацца ў глебу;
час насаджаць і выдзіраць з зямлі;
забіў учора — сёння ацалі;
час разбураць і будаваць палацы;
для плачу час і час, каб пасмяяцца;
час скардзіцца на лёс і час скакаць,
раскідваць камяні і іх збіраць;
час абдымаць і бегчы ад абдымкаў;
збіраць у скрынку, выкідаць са скрынкі;
час, каб знайсці ўсё, час — усё згубіць;
час раздзіраць, сшываць; час, каб любіць,
і час, каб ненавідзець усім сэрцам,

балакаць аб жыцці, маўчаць аб смерці;
ёсць змрочны час вайны, ёсць міру час...

5

Я бачыў пад сонцам: на месцы суда — беззаконне,
дзе праўда павінна ўладарыць — хлусоў
панаванне.
І ў сэрцы сваім я прамовіў: о цемры прадонне!
Распусныя суддзі, адбудзецца суд і над вамі.

І ў сэрцы сваім я сказаў пра сыноў чалавечых,
што гэта жывёліны, розніцы тут аніякай;
як тыя сыходзяць у смертухны злую пустэчу,
таксама і гэтыя: што чалавек, што вужака...

Бо ўсё гэта марнасць, ідзе ўсё ў адзінае месца.
Дзе дух наш набудзе спакой — толькі Богу
вядома,
а цела — а цела ва ўсіх з аднаго, пэўна, цеста:
мы з глебы прыйшлі і нам трэба вяртацца дадому.

І ўбачыў я: самае лепшае ў гэтым сусвеце —
піць келіх жыццёвы, і піць той напой з асалодай,
бо ўрэшце адыдзем, і хто прывядзе паглядзець
нас,
што будзе пасля адыходу?

⁂

*Памяцi Анатоля Мяснiкова*

пражываючы днi
памiраючы ўночы
па шляхах сваiх крочым
мы заўсёды адны

за дзвярыма сцяна
за акном снежань белы
i планета знямела
бо планета адна

бо глыбокае дно
ў гэтым вусцiшным моры
сярод чорнай прасторы
нават сонца адно

i мiльярды гадзiн
бы маўклiвыя воды
БОГ самотны заўсёды
БОГ заўсёды адзiн

# НОВАЕ НЕБА

## ПАЭМА

I ўбачыў я новае неба і новую зямлю, бо першае неба і першая зямля мінулі...

*Адкрыццё 21:1*

Ой вы, дарожанькі людскія,
Пуцінкі вузкія, крывыя!
Вы следам цьмяным снуяцеся
I ўсё блукаеце, бы ў лесе,
Вас горне шлях прасторнай плыні
I далягляд ружова-сіні,
Дзе так панадна свеціць сонца,
Дзе думка тчэ свае красёнцы,
Каб новы свет жыцця саткаць,
Заспакаенне сэрцу даць
I разгадаць яго трывогі!..

*Якуб Колас. Новая зямля*

# Уступ

> Мой родны кут, лугі, крыніца!
> Цяпер для вас я — чужаніца.
>
> *Якуб Колас. Новая зямля*

Мой родны кут... А ці табе я родны?
І кім патрэбна быць, каб прынялі
нібы свайго, як роднага, сярод тых,
хто над сабой не чуе неба подых
і пад сабой не чуе крык зямлі?

На шчасце ці на жаль, адказ вядомы,
і я адзін з іх. Па зямлі іду,
не заўважаючы бяздоннай стромы,
хлушу без стомы я сабе самому,
хаваю ў сэрцы розуму жуду.

Мой родны кут... А можа, сапраўды ўжо
ў краіне гэтай чужаніца я?
І мова гэтая ўжо не мая
і нічыя, хіба што тых, хто выжыў
у кніжным пыле? Сум бібліятэк,
тамоў забытых выцвілыя спіны —
магчыма, толькі гэта лёс адзіны
тых слоў, якія згвалціў чалавек.

Але вяртаецца здаровы клёк
да згвалчанага слова, бо маўчанне,
бясспрэчна, золата, ды ланцужок
са срэбра сэнсу больш карысным стане
для духу, аслабелага ў змаганні.

Бо вечны бой у золата і срэбра.
Вайна і мір — вось вечны выбар наш.
Вайна і свет... Мерыдыянаў рэбры
Зямлі дыханне сціснулі наўсцяж.

Дыханне ж неба хто пачуе? Людзі
не бачаць неба ў смогу гарадоў...
І я такі ж. Хай хтосьці іншы будзе
сцвярджаць у рамантычнай той аблудзе
надсветны статус рыфмаваных слоў.

Паэзія — стварэнне свету мёртвых,
а свет жывых ствараецца агнём,
і першая зямля — струхлелы дом,
і неба першае — як надпіс сцёрты.

## Частка першая

### 1

Па белай пустэльні ідзеш
і ў белую цемру ў знямозе
глядзіш... Азірнуўся — «А дзе ж
сляды маіх ног на дарозе?»

Да рэчкі люстранай бяжыш,
ад смагі ўцякаеш гарачай,
над ёй нахіліўся, глядзіш —
адбітку свайго не бачыш.

І звар’яцеўшы зноў
ад свету маўклівага смеху,

крычыш у бяздонне вякоў...
І не адгукаецца рэха.

2

Бегчы хутчэй па жыцці,
каб не дагналі злодзеі.
Дрэву не прарасці —
ні пры якой нагодзе.

Зерню не прарасці:
тут не зямля — каменне.
Бегчы хутчэй па жыцці —
ды парастрэсваць зерне.

Смагаю паліць рот,
і даганяюць злодзеі!
Гэта ж такі народ —
трэба ўсё каб па модзе:

трэба для думак фасон
і для душы адзенне,
над галавой — парасон...
...ад агнявога зерня!

3

Неба да нас прадзіраецца
праз хмарачосаў брытвы.
Мы не прывыклі кланяцца —
мы прывыклі да бітваў.

Ды з недарэчнай бравадаю
мы адступаем з фарпостаў.

Розум — не тая прылада,
якой карыстацца проста.

Хопіць усім відовішчаў
і, зразумела, хлеба...
Над ап'янелаю плошчаю
плача разумнае неба.

4

Ты не разумнейшы за Бога,
і не лагаднейшы за злодзеяў.
Маўчаць у адказ на рогат —
вось мудрасць стагоддзяў.

Не слухаць, што дурні раяць.
Стаяць, калі ўсё нясецца.
Замкнутая брама раю?
Усім хопіць месца —

не варта маркоціцца, дружа:
сустрэнемся ўсе там аднойчы.
Не варта ў лютую сцюжу
даводзіць, што горача.

Люстэрка не трэба ганіць,
калі штосьці стала з лычыкам.
Ёсць сэнс адпачыць ад змагання
з уласным абліччам.

Бо тайнае стане яўным,
вялізнае — найдрабнейшым.
Не будзеш хітрэйшым за д'ябла
і за жыццё мудрэйшым.

## 5

Праз якія драбніцы жыццё
часам нешта важнае кажа!
Прагучыць, як само адкрыццё,
шум дажджу — і раптам заўважыш,

як трава расце дзень пры дні
і як клён пад акном сталее,
і сур'ёзнай сваёй мітусні
ілюзорнасць усю зразумееш.

Разгарнуў адзінокі мак
сваіх тонкіх пялёсткаў простасць...
І пялёсткаў гэтых няўзнак
зразумееш усю сур'ёзнасць.

## 6

...Надо мной чтоб, вечно зеленея,
Тёмный дуб склонялся и шумел.
*М. Лермантаў*

Я стаю, а ўсё ў прыродным свеце
ў танцы праплывае кругавым.
Я маўчу, а мне спявае вецер,
граючы на голлі залатым.

Танцам кругавым зачараваны,
бачу свет увесь нібы згары:
у лясах празрыстыя паляны
і ў рацэ таемныя віры.

Чую сэрцабіцце сонных кветак
і расінак адчуваю смак.

І мой позірк з позіркам сусвету
раптам сустракаецца няўзнак...

...І адгэтуль пыльная дарога
не маіх слядоў узор пляце,
бо пад ценем дрэва векавога
растварыўся мой нябачны цень.

Толькі зорак белыя суквецці
размаўляюць голасам маім,
а маё дыханне — цёплы вецер,
што згубіўся ў голлі залатым.

## 7

> А он, мятежный, просит бури,
> Как будто в бурях есть покой!
>
> *М. Лермантаў*

Лепшы спеў — гэта спеў маўчання.
Гэта праўда святая, хаця
растварыўшыся ў сузіранні,
станеш атамам небыцця.

І шукаеш ты раўнавагі
паміж словамі і цішынёй,
а бяссэнсіцы макрафагі
ўжо спустошваюць розум твой.

І шукаеш спакой у віхуры,
быццам можна яго там знайсці,
але позірк твой не пануры:
ты яшчэ не стаміўся брысці.

Ты яшчэ спадзяешся аднойчы
адшукаць невядома дзе
храм такі, дзе спакойна ў вочы,
можна існасці паглядзець.

І ў бясконцым гэтым шуканні
табе моц надаюць ізноў
залатая малітва маўчання
і малітва срэбраных слоў.

## Частка другая

### 1

...Прыйдуць дні, калі з таго, што вы тут бачыце, не застанецца каменя на камені; усё будзе разбурана.

*Евангелле ад Лукі 21:6*

Назаўжды быў разбураны храм,
і народ адышоў у выгнанне.
Гэта стала не прытчаю — нам
гэта стала наканаваннем!

Бо аднойчы цераз вякі
зноў паўторыцца святатацтва:
будзе нейкі народ, які
ў асляпленні свайго вар’яцтва

ўласнаручна разбурыць храм
свайго слова, свайго сумлення.

І народзіцца вечны Хам.
І не будзе яму збаўлення.

2

Будзе знішчаны храм, — як сказаў, так і мае ўсё
здзейсніцца
і праз сорак гадоў*, і праз дваццаць кароткіх
вякоў:
кожны ўрэшце стаяць будзе перад аблiччам
бяссэнсіцы,
кожны будзе глядзець на руіны сваіх пабудоў.

Гэта вечны закон, і заўсёдная гэта гісторыя
паўтараецца ў лёсе народаў і ў лёсе душы.
Аніхто вечны дом на струхлелай зямлі не агорае.
Як ні глянь, нашых сэнсаў руіны ляжаць на ўсю
шыр.

3

Хто сказаў, быццам д'ябал заўсёды брутальны?..
Каб жыццё праспяваць — многа ёсць партытур.
Ёсць у кожнага з нас свой хаос персанальны,
і ўладкоўвае кожны
свой утульны абсурд.

У сусвеце адносна ўсё — вось у чым цымус.
Мы апосталы боства святой пустаты.
Ваша вера — у плюс, наша вера — у мінус.
Так пачэсна быць, дружа,
з энтрапіяй на ты!

---

* Ерусалімскі храм быў разбураны рымлянамі ў 70-м годзе, прыкладна праз 40 гадоў пасля прароцтва пра гэта Ісуса Хрыста.

4

> І прысніў: вось лесвіца стаіць на зямлі, а верх яе кранае неба; і вось анёлы Божыя ўзыходзяць і сыходзяць па ёй.
>
> *Быццё 28:12*

...Там анёлы ішлі па лесвіцы —
ён святым тое месца назваў, —
ды хіба ў душы маёй змесціцца
хоць прыступка яе адна?

Бо ў эпоху стальных хмарачосаў
*тое* месца стала святым,
дзе клякоча магма хаосу
і абсурду згушчаецца дым.

З намі, з намі святая магма!
Хто б калісьці падумаць мог,
што на мове абсурду таксама
гаварыць можа з Хамам Бог!

Бо не толькі ў анёльскіх нябёсах
боскіх словаў лунае сцяг —
у эпоху стальных хмарачосаў
слухай пільна клёкат жыцця!

5

Прыслухайся да існавання,
глыбіні змроку сузірай,
таемнае жыцця дыханне
пачуй і — існіну спазнай!

Бог ёсць жыццё. Ні мёртвы догмат,
ні кафедральныя муры
не ўчуюць тваіх думак стогны,
душы пакутнае парыў.

Жыццё, адно жыццё ёсць неба
і, разам, новая зямля.
І ў кожнага адна патрэба —
жыцця вучыцца спакваля

ціхмяны голас пільна слухаць
і мову разумець яго.
Адна ў навуцы гэтай скруха:
сярод крыклівасці багоў

і камянёў святых маўчання
пазнаць складана, хто ёсць Бог.
Таемнае жыцця дыханне
ў бязладдзі тым пачуць — хто б змог?..

6

Чалавек не частка прыроды,
чалавек — частка сябе.
Узрасціць каб свой асяродак,
трэба ўдзельнічаць у сяўбе

агнявога насення неба
на палетках новай зямлі,
хоць не сейбітам — хоць бы глебай,
хоць адной баразной раллі.

Каб пакінуць жывёльны статак,
трэба тую раллю араць

і ў жыццёвы, боскі, парадак
праз бяссэнсіцу пранікаць.

Між хаосу парадак зведаць —
вось выток усяго і працяг.
Чалавек не частка сусвету,
чалавек — вучань жыцця.

Чалавек яшчэ не асоба.
Лёс асобы — заўсёдны стан
барацьбы — за адну аздобу,
за таемны адзін талісман —

ланцужок са срэбра каштоўны.
...Вечны пошук і вечны бой...
. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .
І, магчыма, на небе новым
чалавек стане ўрэшце сабой.

## 7

А храма я не бачыў у ім, бо Госпад Бог Усеўладны — храм ягоны...

*Адкрыццё 21:22*

На *ты* лепей з Богам і з маці.

*Р. Барадулін*

Не «Ён», не «Яно», а «Ты» —
адзіны прыдатны займеннік,
каб вырвацца з пустаты
ў асобаснае вымярэнне.

Сустрэцца з жыццём твар у твар,
бо з ім як з асобаю трэба.
Адчужанасці кашмар
перамагае неба,

каб кожнае «ты» стала «я»
і «мы» не гучала прысудам.
*Там* новая будзе зямля,
дзе голас не стане гудам,

дзе цэглай не стане храм,
а слова зноў плоццю стане,
і мову набудзе Хам.
І скончыць сваё блуканне.

## Эпілог

Прасторны шлях! калі ж, калі
Ты закрасуеш на зямлі
І злучыш нашы ўсе дарогі?

*Якуб Колас. Новая зямля*

...Бо вузкая брама і цесная дарога вядуць у жыццё, і нямногія знаходзяць іх.

*Евангелле ад Мацвея 7:14*

Адно пытанне маем усе мы —
больш цяжкага няма і больш старога
(а чалавек — заўжды пытанне Богу) —
не дапамогуць тоўстыя тамы.

Сам-насам кожны з тайнаю быцця
адказ шукаць у адзіноце будзе.
Ідуць нібы адной дарогай людзі,
але бязлюдны навакол прасцяг.

Натоўп нябачных ценяў па зямлі
вандруе ў пошуках свайго парога,
а знойдуць — быццам бы і не знайшлі.
І так заўжды! О вузкі шлях, калі
ты зробішся шматлюднаю дарогай?..

# Змест

## Прырода цішыні

* * * Знікай, мая туга... 3
* * * Ты варушыш паглядам вершаванае смецце... 4
Два варыянты 5
У прадчуванні восені. Трыпціх 6
Адкрыццё адзіноты 8
* * * Хвіліны ёсць, калі маўчаць нябёсы... 10
* * * Я не ведаю, як разумець гэты свет... 11
* * * І адкуль такое адчуванне... 12
* * * Распусціў свае цені горад... 13
* * * Дайце мне паверыць безаглядна... 14
* * * Гэты горад павіс нада мною, як меч... 15
* * * Цішынёй сагрэты час... 16
* * * Змяркаецца... 17
Страшна 18
* * * Мы ідзём па-над хвалямі... 19
* * * Не адчуўшы дажджу на далоні... 20
* * * Калі распранаецца свет прад тваімі вачыма... 21
Пытальнік на палях 22
* * * Тут горад ліецца ракою бязглуздзіцы... 23
* * * Зноў сакавік да лютага лашчыцца... 24
* * * Гэта ты, мая ноч, мая смешная дзеўка... 25
Экзальтацыя 26
Паклонніку мастацтва 27
* * * Радкі вялікія ўзнікаюць толькі ноччу... 28
* * * Я хачу прабіцца да сэнсу... 29

Вяртанне да паэзіі ... 30
«Так было не аднойчы... » ... 31

**Пародыі без арыгіналаў**

* * * Назапасіў снежань бясснежны... ... 38
* * * Сярод зорных крывадушных шэптаў... ... 39
* * * Мы ў дзвюх краінах – я і ты... ... 40
* * * Твая фатыга зменіцца тугой... ... 41
Трыпціх ... 42
Псеўдахоку ... 44
* * * Эх, якое шчасце гэта... ... 45
Усё напісана да нас ... 46

**Гефсіманскае галлё**

* * * Мы жылі ў гэтым свеце, не верачы... ... 47
* * * Benedictus qui venit in nomine Domini... ... 48
* * * Вазьмі мой голас, працягні руку мне... ... 49
* * * Ты разгарні маю тугу... ... 50
* * * Веру. І гэтая ноч... ... 51
* * * Разальецца сонца ў небе полымем... ... 52
* * * Цень гефсіманскага галля... ... 53
* * * Спыні мяне, о Госпадзе, спыні... ... 54
* * * Дакрануцца хачу да Тваіх ледзь прыкметных адбіткаў... ... 55
* * * І надыдзе вялікае свята... ... 56
* * * Мая дарога кволай ніткай тчэ... ... 57
* * * Дзень прайшоў, яшчэ адзін з безлічы... ... 58
Знікненне ... 59
Раство і Уваскрэсенне ... 60

* * * Ціха шэпча вятрыска... .......................................................... 62
* * * На паліцы – старых паперчын... ...................................... 64
З Псалтыра ............................................................................. 65
З Эклезіяста ........................................................................... 66
* * * пражываючы дні ............................................................. 69

**Новае неба. Паэма** ............................................................. 70

**Дуброўскі-Сарочанкаў, А.**
Д79 Эстэтыка маўчання : вершы, паэма / Алесь Дуброўскі-Сарочанкаў. — Мінск : Кнігазбор, 2011. — 88 с. — (Бібліятэка Саюза беларускіх пісьменнікаў «Кнігарня пісьменніка» ; вып. 14)
ISBN 978-985-7007-02-8.

Першы зборнік паэзіі Алеся Дуброўскага-Сарочанкава — «Паміж небам і багнаю» — выйшаў у 1997 годзе ў «Бібліятэцы часопіса "Маладосць"». Новая кніга адрозніваецца шырынёй дыяпазону інтанацый: ад іроніі (раздзел «Пароды без арыгіналаў») да філасофска-багаслоўскай сур'ёзнасці (лірычная паэма «Новае неба»). Пры гэтым праз усю кнігу праходзіць адзін матыў — Слова і маўчанне...

**УДК 821.161.3-1**
**ББК 64 (4 Беи)-5**

*Літаратурна-мастацкае выданне*

Бібліятэка Саюза беларускіх пісьменнікаў
«Кнігарня пісьменніка»

Выпуск 14

**Дуброўскі-Сарочанкаў** Алесь
(Дуброўскі Алесь Уладзіміравіч)

**ЭСТЭТЫКА МАЎЧАННЯ**

*Вершы, паэма*

Адказны за выпуск *Г. Вінярскі*
Рэдактар *В. Андрэева*
Вёрстка *Л. Ваўчок*
Карэктар *В. Андрэева*

Падпісана да друку 3.06.2011. Фармат 80х100 1/32.
Папера афсетная. Друк афсетны. Ум. друк. арк. 4,07.
Ул.-выд. арк. 2,04. Наклад 300 ас. Зак. 459.

ПУП «Кнігазбор».
Ліцэнзія № 02330/0003924 ад 08.04.11.
Вул. Я. Лучыны, 38-93, 220112, Мінск.
**Тэл./факс (017) 207-62-33,**
**тэл. (029) 772-19-14, 682-83-86.**
E-mail: bkniha@tut.by

Надрукавана з арыгінала-макета заказчыка
ў ААТ «Аргбуд».
Ліцэнзія № 02330/0494197 ад 03.04.09.
Вул. Берасцянская, 16, 220034, Мінск.